*Т.В. КУЗЬМІНІЧ*

# ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ РЭСУРСЫ НББ: КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ФАРМІРАВАННЯ

Інфармацыйныя рэсурсы (ІР) Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) уяўляюць сабой культурную скарбніцу беларускага народа. Яны адлюстроў-ваюць увесь універсум ведаў чалавецтва, інтэлектуальную разнастайнасць свету і з’яўляюцца незаменнай часткай сусветных інфармацыйных рэсурсаў як гісторыка-культурная спадчына беларускага народа. Іх фарміраванне арыентавана на рэалізацыю канстытуцыйнага права грамадзян Беларусі на свабодны доступ да інфармацыі, задавальненне універсальных інфармацыйных патрэбнасцей грамадства, развіццё інтэлектуальнага і навуковага патэнцыялу краіны.

Сёння перад Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі стаяць асобыя задачы. Ёй надаецца статус не толькі галоўнай бібліятэкі краіны, але і рэспубліканскага інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра. Гэта знайшло адлюстраванне ў шэрагу дакументаў: Канцэпцыі стварэння рэспубліканскага інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра на базе ўзводзімага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (зацверджана Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 555 ад 26.05.2005 г.) [1], канцэпцыях і праграмах, якія вызначаюць асноўныя падыходы і шляхі рэалізацыі задач развіцця інфармацыйных рэсурсаў, арганізацыі бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, сацыякультурнай дзейнасці, мастацкага афармлення новага будынка НББ. Канцэпцыя фарміравання інфармацыйных рэсурсаў НББ (2005) адлюстроўвае перспектывы дзейнасці НББ па кумуляванні, папаўненні, стварэнні і захаванні ІР, кірункі развіцця навукова-даследчай работы, супрацоўніцтва з рознымі сацыяльнымі інстытутамі сістэмы дакументных камунікацый, вучэбнымі ўстановамі [2]. У гэтым артыкуле мы спынімся на асобных, на наш погляд, важных пытаннях, закранутых у апошняй названай Канцэпцыі.

Фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў – адзін з галоўных кірункаў дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі. Менавіта яго паспяховая рэалізацыя стварае аснову для развіцця бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, сацыякультурнай, навукова-даследчай і іншых відаў дзейнасці бібліятэкі.

Асноўнымі арыенцірамі ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў НББ застануцца нацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці, а асноўнымі прынцыпамі – сістэмнасць, навуковасць, сацыяльная абумоўленасць, мабільнасць, планавы характар, цэнтралізацыя і дэцэнтралізацыя, каардынацыя і кааперацыя, універсальнасць, аднаразовасць апрацоўкі ўваходнага дакументнага патоку і шматразовасць выкарыстання атрыманай інфармацыі.

Фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў НББ – надзвычай складаная задача. Яе паспяховая рэалізацыя на сучасным этапе магчыма толькі ва ўмовах канвергенцыі інфармацыйных рэсурсаў, назапашаных і ствараемых іншымі бібліятэкамі краіны, а таксама архівамі, музеямі, інфармацыйнымі цэнтрамі і службамі. Асноўнымі кірункамі фарміравання інфармацыйных рэсурсаў НББ з’яўляюцца:

– збор максімальна поўнай калекцыі нацыянальных ІР;

– адбор і акумуляванне лепшых і найбольш карысных для грамадства су- светных ІР;

– стварэнне інфармацыйна-пошукавых сістэм па інфармацыйных рэсурсах НББ;

– стварэнне навігатараў па агульнадаступных нацыянальных і найбольш запатрабаваных сусветных электронных ІР;

– стварэнне на карпаратыўных пачатках зводнага электроннага каталога бібліятэк Беларусі;

– стварэнне нацыянальнага банка даных аўтарытэтных / нарматыўных запісаў;

– фарміраванне нацыянальнага банка даных нацыянальнага дакумента;

– стварэнне нацыянальнай электроннай бібліятэкі;

– стварэнне шырокага спектра аналітычнай інфармацыі для інфармацыйнага забеспячэння кіраўніцкай, навуковай і іншых відаў дзейнасці;

– фарміраванне архіва нацыянальнага дакумента.

Названыя кірункі можна ўмоўна падзяліць на два асноўныя блокі, адзін з іх тычыцца дакументнага фонду – асновы існавання НББ як сацыяльнага інстытута, другі – генерыруемых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

намаганнямі спецыялістаў бібліятэкі інфармацыйных рэсурсаў, без якіх немагчыма рэалізацыя ні сутнаснага прызначэння Нацыянальнай бібліятэкі, ні выканання ёю задач як рэспубліканскага інфармацыйнага цэнтра.

Дакументны фонд НББ уяўляе сабой выключную гісторыка-культурную каштоўнасць. Ён складае аснову сукупнага дакументнага фонду нашай краіны. Першапачаткова фонд бібліятэкі ствараўся на базе калекцый бібліятэкі БДУ, Мінскай духоўнай семінарыі, прыватных збораў Я.Ф.Карскага, М.А.Янчука, Я.Купалы, А.П.Сапунова, а таксама шляхам атрымання абавязковых бясплатных экзэмпляраў друкаваных выданняў СССР і БССР і закупкі асобных выданняў. Сёння ў фондзе НББ налічваецца больш за 8 млн. адзінак захавання, у тым ліку 70 тыс. рэдкіх, старадрукаваных кніг і рукапісаў; 2,8 млн. перыядычных выданняў; 81 тыс. нот; 31 тыс. аўдыёвізуальных дакументаў; 109 тыс. дакументаў выяўленчага мастацтва; больш за 15 тыс. карт; 700 тыс. аўтарэфератаў дысертацый; 122 тыс. мікраформаў. Нацыянальная бібліятэка з'яўляецца цэнтрам дэпазітарнага захавання матэрыялаў ААН, ЮНЕСКА, Савета Еўропы, АБСЕ. Асаблівую каштоўнасць для захавання культурнай памяці нацыі мае больш чым паўмільённая калекцыя нацыянальных дакументаў і экстэрыёрыкі (беларусікі).

Дакументны фонд Нацыянальнай бібліятэкі ўключае дзеючую, дапаможную і архіўную часткі. Дзеючая частка фонду прызначана для выкарыстання ў працэсе інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання, якое ажыццяўляецца як ўнутры Нацыянальнай бібліятэкі, так і за яе межамі. Дапаможныя (службовыя) фонды з’яўляюцца дублетнымі ў адносінах да дзеючых фондаў і прызначаны для іх аднаўлення, ажыццяўлення розных формаў міжбібліятэчнага дакументаабмену. Архіўная частка фонду ўяўляе сабой страхавы фонд нацыянальнага дакумента, прызначаны для пастаяннага захавання.

Асноўнымі крытэрыямі адбору дакументаў для папаўнення фондаў Нацыянальнай бібліятэкі з’яўляюцца: прыналежнасць дакумента да нацыянальнай інфармацыйнай прадукцыі і беларусікі (экстэрыёрыкі); навуковая, грамадская значнасць замежных дакументаў, актуальнасць і навізна прадстаўленай у іх інфармацыі; унікальнасць дакументаў як помнікаў беларускай і сусветнай культур; забеспячэнне аптымальнай экзэмплярнасці дакументаў у адпаведнасці з грамадскай патрэбнасцю.

У Беларусі пакуль што да цяперашняга часу не прыняты закон аб абавязковым экзэмпляры, які б дазволіў пашырыць пералік відаў дакументаў, што падлягаюць абавязковай бясплатнай рассылцы, і заканадаўча замацаваць механізм штрафных санкцый у выпадку яго парушэння. Неабходна адзначыць, што, нягледзячы на недасканаласць існуючай заканадаўчай базы, намаганнямі супрацоўнікаў НББ лакуны ў патоку абавязковага экзэмпляра друкаваных дакументаў зведзены да мінімуму і складаюць не больш за 2%.

Асаблівая ўвага надаецца выяўленню і пошуку дакументальнай экстэрыёрыкі, а таксама беларускіх нацыянальных дакументаў, якія аказаліся за межамі краіны ў сувязі са спецыфікай яе геаграфічнага становішча і гістарычных рэалій развіцця. Актыўная дзейнасць спецыялістаў НББ, у прыватнасці выкарыстанне магчымасцей міжнароднага кнігаабмену, дазваляе штогод папаўняць фонд у сярэднім на 200 выданняў, якія па моўнай, змястоўнай і аўтарскай прыметах адносяцца да Беларусі. Асабліва перспектыўным, на наш погляд, з’яўляецца больш шырокае выкарыстанне электронных формаў прадстаўлення інфармацыі як на ўзроўні пошуку нацыянальных дакументаў і экстэрыёрыкі, так і папаўнення імі калекцыі НББ. Гэтаму будуць садзейнічаць значнае паляпшэнне камп’ютэрнага аснашчэння ў новым будынку бібліятэкі, удасканальванне адпаведных тэхналагічных працэсаў і рэгуляванне прававых аспектаў дзейнасці.

Архіўная частка дакументнага фонду НББ можа фарміравацца на аснове архіва друку Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі, якая была створана ў 1922 г. як структурнае падраздзяленне НББ (тады Беларускай дзяржаўнай і універсітэцкай бібліятэкі) і існавала ў яе складзе да 1977 г. Сёння, зыходзячы з перасякаемасці выконваемых функцый і эканамічнай мэтазгоднасці, кніжная палата павінна арганічна ўліцца ў Нацыянальную бібліятэку. Акрамя названай “традыцыйнай” (папяровай) часткі архіва, будзе развівацца электронная. Яна ствараецца ўжо на сучасным этапе і ўяўляе сабой электронныя архіўныя копіі дакументаў, якія маюць нацыянальную, навуковую, гісторыка-культурную каштоўнасць.

Кірункамі дзейнасці НББ будуць не толькі акумуляванне і развіццё найбольш поўнага і запатрабаванага ў краіне дакументнага фонду, а і генерыраванне шырокага спектра сацыяльна неабходнай інфармацыі: інфармацыйна-пошукавага апарату на дакументны фонд Нацыянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкі, банка даных звестак аб нацыянальным дакуменце, нацыянальных аўтарытэтных / нарматыўных запісаў, крыніц перспектыўнай бібліяграфіі, аналітыка-інфарма-цыйнай прадукцыі для прыярытэтнага інфармацыйнага забеспячэння важнейшых сацыяльных праграм краіны і інавацыйнай дзейнасці, нарматыўна рэгламентуючых, навуковых, навукова-папулярных, вытворча-практычных, даведачных, рэкламных і іншых матэрыялыў у галіне інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці, электроннай бібліятэкі.

Асноўныя патрабаваннямі да функцыянаванння інфармацыйна-пошукавых сістэм з'яўляюцца паўната, дакладнасць і шматаспектнасць прадстаўлення масіваў дакументаў, якія захоўваюцца ў НББ, а таксама аператыўнае адлюстраванне дакументнага патоку, што паступае. Паспяховае стварэнне і развіццё інфармацыйна-пошукавых сістэм магчыма на аснове апошніх навукова-метадычных распрацовак у інфармацыйна-бібліятэчнай практыцы. Існаваць масівы дакументаў павінны на матэрыяльных носьбітах, не толькі адэкватных сучасным тэхнічным і тэхналагічным дасягненням, а і зручных для карыстальнікаў (на дадзеным этапе – карткавых і электронных, у перспектыве – скарачэнне ўдзельнай вагі карткавых каталогаў і картатэк і замена іх лічбавымі). Кансерваванне той ці іншай часткі інфармацыйна-пошукавых сістэм абумоўлена запатрабаванасцю яе ў працэсе інфармацыйна-пошукавай дзейнасці карыстальніка і/ці даведачна-інфармацыйных і іншых службаў НББ, магчымасцю адэкватнай замены, вытворчай мэтазгоднасцю.

Асноўным элементам інфармацыйна-пошукавых сістэм НББ з'яўляецца электронны каталог (ЭК). Сёння яго аснову складаюць бібліяграфічныя запісы, ствараемыя з 1993 г. у выніку каталагізацыі ўваходнага дакументнага патоку ў лакальным фармаце і канвертуемыя ў нацыянальны камунікатыўны фармат, а таксама запісы, атрыманыя ў выніку рэкаталагізацыі нацыянальнага дакумента, перыядычных выданняў (акрамя газет) і выданняў з працягам. З сакавіка 2004 г. НББ распачала вялікую работу па рэтраканверсіі карткавых каталогаў. У выніку рэалізацыі першага этапу гэтага праекта карыстальнікі атрымаюць графічны вобраз карткавых каталогаў НББ, супрацоўнікі – запісы для далейшага распазнавання, структуравання і папаўнення імі электроннага каталога. У перспектыве ЭК будзе адлюстроўваць увесь фонд бібліятэкі не толькі па відавой прымеце, а і па храналагічнай прымеце і забяспечыць пошук інфармацыі як аб асобным дакуменце, так і любой сукупнасці дакументаў, сувязь з іх паўнатэкставымі лічбавымі копіямі. Неад'емнай часткай ЭК з'яўляюцца аўтарытэтныя/нарматыўныя запісы. Іх стварэнне здзяйсняецца ўжо зараз, напрацоўваюцца масівы на імя асобы, геаграфічныя назвы і іншыя энтытэты, якія ў перспектыве складуць аснову нацыянальнага банка даных і будуць папаўняцца ў рэжыме каталагізацыі ўваходнага дакументнага патоку з улікам магчымасці пераўтварэння даных з іншых інфармацыйных прадуктаў, імпарту запісаў буйнейшых бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў свету.

НББ у бліжэйшай перспектыве ўзначаліць сістэму карпаратыўнай каталагізацыі і фарміраванне зводнага электроннага каталога, даступнага для пошуку і/ці імпартавання інфармацыі кожнай адпаведна абсталяванай бібліятэкай краіны. Гэты каталог забяспечыць аб'ём, глыбіню, разнастайнасць і якасць прадастаўлення інфармацыі. Аптымальнымі ўмовамі яго стварэння з'яўляюцца стандартызацыя тэхналагічных працэсаў, падтрымка агульных прынцыпаў каталагізацыі, уніфікацыя правілаў складання бібліяграфічнага апісання, выбар сумяшчальнага лінгвістычнага забеспячэння, наяўнасць карэлюемых тэхнічных і праграмных сродкаў, кааперацыя і каардынацыя намаганняў розных бібліятэк і, магчыма, інфармацыйных цэнтраў.

Важным кірункам дзейнасці НББ па генерыраванні ІР будзе фарміраванне банка даных аб нацыянальным дакуменце – бібліяграфічнай мадэлі (з уключаемымі фактаграфічнымі элементамі) дакументных патокаў, звязаных з Беларуссю па тэрытарыяльнай, аўтарскай, моўнай і змястоўнай прыметах. Здзяй- сненне гэтага магчыма на аснове кансалідацыі створаных раней бібліяграфічных рэсурсаў НББ і Нацыянальнай кніжнай палаты, аб'яднання намаганняў па ажыццяўленні дзяржаўнага бібліяграфічнага і статыстычнага ўліку нацыянальных дакументаў, стварэння крыніц бягучай і рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі і пашырэння іх рэпертуару.

Неабходнымі ўяўляюцца змены ў ствараемай НББ крыніцах перспектыўнай бібліяграфіі, якая пры належнай рэалізацыі магчымасцей электроннай апрацоўкі даных будзе адлюстроўваць не толькі інфармацыйную прадукцыю бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў Беларусі, а і выдавецкую прадукцыю айчынных выдавецтваў і выдавецкіх арганізацый у цэлым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спектр ствараемай НББ аналітыка-інфармацыйнай прадукцыі, разлічанай на задавальненне і фарміраванне інфармацыйных патрэбнасцей асобных груп карыстальнікаў (кіруючых органаў краіны, кіраўнікоў устаноў, прадпрыем- стваў і арганізацый, вучоных, студэнтаў і інш.), будзе пашыраны ў параўнанні з сучасным пералікам электронных і друкаваных бібліяграфічных і фактаграфічных дакументаў і баз даных па відавой, змястоўнай прыметах. Адбудуцца змены і ў тэхналогіі іх падрыхтоўкі, стануць магчымымі рэалізацыя прынцыпу аднакратнай апрацоўкі дакументнага патоку і шматкратнага і шмат-аспектнага выкарыстання атрыманай інфармацыі, а таксама стварэнне баз даных спецыяльнага прызначэння на карпаратыўных пачатках. Аналітыка-інфармацыйная прадукцыя будзе прадстаўлена навукова-дапаможнай і прафесійна-вытворчай рэфератыўнай, агляднай, анатаванай і сігнальнай інфармацыяй, а таксама фактаграфічнай, графічнай і паўнатэкставай у формах, якія адпавядаюць сучаснаму ўзроўню навукі, тэхнікі, культуры і запатрабаваны карыстальнікамі; інфармацыйна-бібліяграфічнымі матэрыяламі папулярнага характару ў формах, якія таксама адпавядаюць сучаснаму ўзроўню навукі, тэхнікі, культуры і з’яўляюцца мэтазгоднымі для прадастаўлення той ці іншай групе карыстальнікаў.

Надзвычай перспектыўным і, бадай, найменш рэалізаваным кірункам генерыравання інфармацыйных рэсурсаў НББ з’яўляецца фарміраванне нацыянальнай электроннай бібліятэкі – электроннай калекцыі нацыянальных дакументаў. Неабходны распрацоўка канцэптуальных і нарматыўна-рэгламента-ваных асноў яе стварэння; заканадаўчае замацаванне сістэмы паступлення ў Нацыянальную бібліятэку нацыянальных электронных ІР; фінансаванне шырокамаштабнай работы па алічбоўцы нацыянальных дакументаў, якія маюць гісторыка-культурнае, навуковае значэнне і карыстаюцца павышаным попытам, а таксама патрабуюць стварэння страхавых копій; прыняцце дзяржаўнай праграмы “Памяць Беларусі” і забеспячэнне яе паэтапнай рэалізацыі; арганізацыя пастаяннага вывучэння сусветнага інфармацыйнага рынку і на аснове гэтага вызначэнне пераліку міжнародных, замежных і нацыянальных электронных ІР, доступ да якіх патрэбны ў першую чаргу; стварэнне кансорцыумаў з мэтай рацыянальнага набыцця і выкарыстання электронных дакументаў.

Арганізацыя ЭБ забяспечыць магчымасць аперыравання вялікімі аб’ёмамі інфармацыі, стварэнне ўмоў неабмежаванага доступу да сусветных крыніц інфармацыі ў электроннай форме, адбору і ўпарадкавання розных электронных калекцый, а таксама фарміраванне і прадстаўленне ў сусветнай прасторы сваіх, уласных. Гэта дапаможа на якасна новым узроўні задавальняць інфармацыйныя патрэбнасці, на значнае змяненне якіх паўплывала інтэнсіўнае развіццё камунікатыўных сістэм, тэхнікі і тэхналогій.

Рэалізаваць усе вышэйпералічаныя кірункі фарміравання ІР на якасна высокім узроўні немагчыма без цеснага супрацоўніцтва НББ з іншымі бібліятэкамі, архівамі, органамі навуковай інфармацыі, а таксама любымі іншымі рэсурсастваральнымі інфармацыйнымі ўстановамі Беларусі.

Каардынацыя работы па фарміраванні ІР дазволіць стварыць спрыяльныя ўмовы для размеркавання і выкарыстання матэрыяльных сродкаў, паўнамоц-тваў у складанні бібліяграфічнага запісу, генерыравання інфармацыйных прадуктаў і іх выкарыстання, забеспячэння роўных правоў выкарыстання агульнадаступных ІР. Узаемадзеянне мэтазгодна развіваць на этапах камплектавання дакументнага фонду, фарміравання бібліяграфічнага запісу, стварэння інфармацыйнай прадукцыі, а таксама забеспячэння доступу да ІР і абароны інфармацыі.

Як бачна, перад НББ стаяць вялікія задачы і па фарміраванні дакументнага фонду, і стварэнні інфармацыйнай прадукцыі. Іх паспяховая рэалізацыя дазволіць бібліятэцы выконваць ролю важнейшага элемента інфармацыйнай інфраструктуры краіны і забяспечваць грамадзянам Беларусі магчымасць атрымання інфармацыі з усіх запатрабаваных імі сектараў сусветнай інфармацыйнай прасторы.

---

[1] *Концепция* создания республиканского информационного и социокультурного центра на базе строящегося здания ГУ “Национальная библиотека Беларуси” // Бягучы архіў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

[2] *Концепция* формирования информационных ресурсов НББ // Бягучы архіў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ